у нас не было. Быў прыгон, былі у магілеўшчыне араклееўскіе ваенные пасёлкі... чаго добраго і гэты праект стане законам і будзе спаўняцца. Што-ж з гэтаго выйдзе?

Бывалі-ж за прыгону прыклады, што падданые не перэнасілі здзеку розак і канчалі самагубствам. С тэй пары прайшло болей 50 гадоў. Пачуцьце ўласнаго гонару дужа павялічылося, а нават само буянства шырыцца с тэй прычыны, што акружаючые варункі нездавольваюць людзей... Да чагож гэта прывядзе? Што буянства праз гэта ня счэзне, аб тым німа што і гаварыць, затое, дужа быць можэ, што народ ешчэ болей азьвярэе.

Няўжо-ж урад гэтаго хочэ? Енжэ кажэ, што хочэ змагацца з буянствам. Дык нашто-ж змагацца са злом так, каб яно ня меншало а болей развівалося. Нашто здзекавацца над цёмным народам, у катораго усякіх бед і бяз гэтаго многа? Каму гэта патрэбна? Нашто?

*Лявон Гмырак.*

---

## Селянскіе дзеці.

(*Ліст з Мікалаеўшчыны, Мінск. губ.*)

У час сенакосу і жніва трудна знайсьці ў сяле старога чэлавека. Усе, хто мае толькі сілы, або не зьвязан ліхам—хваробаю, выходзіць на луг, на поле на ўвесь дзень. Многа селян ідзе на заработкі на цэлые нядзелі і месяцы, і сёлы стаюцца дзяціным царствам. Але і дзяцей на ўзросьці не знайдзеш ў сяле: дзеці 8—10 гадкоў ідуць ужо так сама на работу за сваімі бацькамі або ў поле за жывёлаю. Маленькіх дзетак ад паўтара года і меней забіраюць з сабою маткі, а ў сяле астаецца тая драбяза, каторая толькі сама змагае перэстаўляць ногі. Трэба прайсьці у летні дзень па вуліцы, каб убачыць гэту галодную, заморэную, закіданую, абарваную голь-дзетвару.

Якжэ праводзіць дні і чым жыве гэта дзетвара?

Трэба сказаць, што весна і лета — самые цяжкіе для селян часы. Увесь запас леташняго года даўно вышоў, і часта німа чаго есьці. Прыходзіцца сілкавацца, як тые пташкі. на каторых паказываў Хрыстос. Ідучы на поле, маці накорміць, чым Бог паслаў, дзетак, а на дзень пакіне ім гаршчэчак бульбы, балазе яна пасьпела, або акрайчык хлеба, калі ён ёсць. Але ласьне гэтай яды даволі? І дзеці папаўняюць гэту нестачу стравы, рознаю сыромлею, якую толькі можна знайсьці ў агародзі і на полі. Я ужо ня буду казаць пра тое, як можэ абазвацца на здароўі і на росьці дзетак гэта страва. Так растуць, так гадуюцца нашы селянскіе дзеці.

Што належыць да жыцьця іх душы, то тут справа пастаўлена ешчэ горш. Дзеці ніколі ні бачаць добраго прымеру, не пачуюць разумнаго слова, бо чаму навучацца яны ад плытнікоў—я кажу аб нашым сяле,—каторые сягды—тагды забегаюць да манапольні і перэсыпаюць сваю мову паскуднымі славамі, каторымі кожная п'ьная свіньня стараецца пафарсіць? А ці мала такіх п'яных праходзіць прад вачыма дзяцей? І дзеці скора перэймаюць усю гэту, брыдоту старэйшых і самі лаюцца ня горш старых, грубеюць змалку, запаганіваюць сваю чыстую душу.

А астаўленые без ўсякаго дагляду, дзеці робяць, што хочуць. Трэба ім чым—нібудзь заняцца, забавіцца, і вот яны бяруць пустую паўбутылку с казённаго наклейкаю, наліваюць туды вады, садзяцца за стол і пачынаюць піць чаркамі ваду. Так падгатаўляюцца к далейшаму свайму жыцьцю нашы дзеці. Тут жэ яны, гледзячы на старшых навучаюцца ўсяму таму, што ў агуле робіць пекла нашаго жыцьця Безпрызорные дзеці ходзяць купацца, топяцца, і некаму іх ратаваць, хварэюць, уміраюць. І ніхто на гэта не зварачае увагі. Бацькі самі так гадаваліся, і ім німа калі разбірацца ў пытаньнях лепшай умовы гадаваньня дзетак. Тые-ж, хто могбы зьвярнуць на гэта увагу і зрабіць які—нібудзь добры пачын, ня робяць гэтаго за тым, што яны звыкліся з такімі зьявамі, жывучы у сёлах, або проста за тым, што гэтаго німа ў цыркулярах ад начальства ды і не прывыклі яны працаваць на агульную карысць і ўзяцца за дзела с таго боку, катораго не дагледзіло вока цыркулярыстаў.

Сярод гэтых бяздоглядных дзетак ёсць ешчэ і такіе дзтці, чые жыцьцё ад самых пялёнак астаецца такім безрадасным, дзеці, для каторых адна толькі сьмерць зьяўляецца праўдзівым збаўленьнем ад гэтаго жыцьця пакуты. Гэта—дзеці—сіроты, дзеці, у каторых ёсць мачыхі. Гэта дзеткі, пра каторых па справядлівасьці можна сказаць: яны зачэрпнуні поўную чашку атруты жыцьця, ніразу не пакаштаваўшы яго радасьці. З вялікім жалем і больлю я павінен сказаць, што і ў нашым сяле, пра каторае я заўсюды думаў, як пра прымернае сяло, дзе ніколі німа кражаў, дзе жывуць такіе простые і добрые; гатовые адгукнуцца на чужое горэ людзі, ёсць такіе мачыхі. Я ня буду называць яе імя—яна, дзякуй Богу, адна у нас на ўсё агромнае сяло, і яе ўсякі адразу назаве вам. Я толькі скажу малую долю таго, што вытварае гэта мачыха над нешчасным дзіцём. Гэтаму хлопчыку чатыры гадкі, але на погляд яму можна даць ня больш двох гадоў. Толькі галава у яго непамернаго росту, у яго дзіўные вочкі ў каторых відна яго забітая душа. На твары яго заўсюды ляжаць глыбокіе сьляды забітасьці, нешчасьці. З яго цела ніколі ня сходзяць сінякі і струпы. сам ён ціхі, баязьлівы, і твар яго ніколі не асьвечаецца усьмешкаю. Мачыха абходзіцца з ім злосна, жорстка толькі за тое, што ён—дзіця другой жанчыны. Яна здзекуецца і запраўляе пасынка здзекавацца над памяцьцю яго мацеры, над сваякамі яе. Што чуе гэтае дзіця тагды, калі ён, пабіты мачыхаю, скрозь слёзы павінен, па трэбаваньню мачыхі, перэкрывіць свайго дзеда, паказаць, як Піліп тушыць сьвечкі ў цэркві? Селяне! вы не павінны дапусціць такога здзеку над сіратою. Ніхай прыдуць паважаные гаспадары і скажуць ёй пра гэта. Ніхай стараста, як сельская ўласць, патрэбуе ад яе споўніць гражданскі свой закон. Ніхай бацюшка, як пастыр, прачытае ей настаўленьне прад тварам Бога і людзей. А калі гэта не паможэ, то вы павінны судом заправіць ваўчыцу быць чэлавекам. Закон карае гаспадара, калі ён тыраніць сваю жывёлу, і закон ня застанецца глух там, дзе кат—мачыха ўсчувае нявінные дзіця і дзе ліюцца сірочые сьлёзы.

Усе вялікіе людзі, ўсе прапаведнікі дабра, аснавацелі новых рэлігій любілі дзяцей. Хрыстос гаварыў, што дзецям належыць царство на небі: хто ня будзе прост, як дзіця, той ня ўвойдзе ў рай. І маткі паднасілі да яго дзяцей, каб ён палажыў на іх свае рукі. Мы-ж гэта забываем і раней пынім і кормім целятак і парасят, а потым ўспамінаем, калі яны не дадуць аб сабе вестак плачем, што у нас есць дзеці каторых трэба накарміць. Калі мы заводзім сад і садзім дрэўцы, то мы, ведаючы сорт іх. ведаем, які яны дадуць плод. Дзіця-ж—гэта вялікая загадка. Мы ня ведаем, што з яго выйдзе, як яно стане ўзрослым чэлавекам. Можэ ў тых дзетках, каторые захлынуліся ў вадзе па нашай ласцы, ў тым хлопчыку, катораго катуе мачыха — зьвер, хаваліся, ці хаваюцца іскры Божаго агню, можэ ім належало сказаць новае слова людзям, выдумаць штось такоя, што дало-б палёгку для нашаго жыцьця.

Каб даць нашым селянскім дзецям хоць якую палёгку, каб зрабіць іх жыцьцё больш чэлавэчным я зварачаюся да добрых людзей і разумных, можэ яны дадуць разумную раду і працягнуць руку помачы для закіненых дзетак. З свайго боку я параіў—бы устроіць летам дзенные прытулкі для дзяцей, дзе-б іх кармілі і дзе-б быў за імі догляд. І гэта ня трудна зрабіць. У кожным сяле ёсць школа. каторая ўсё лета пустуе. Чаму-б не збіраць там дзяцей? тым болей, што гэту школу ім належыць прайці. Ня трэба толькі чекаць, каб ўсё рабілося само, або каб хто за нас зрабіў. І грошы у нас знайдуцца: схадзеця да сядзельца і спытайце, колькі вёдзёр гарэлкі прапусьцілі нашы горлы! 1000 вёдзер! Цяпер палічыця, колькі гэта будзе каштаваць: вядро гарэлкі каштуе 8 р. 40 коп., а вазьмеця іх тысячу, і у нас будзе 8,400 руб. Ці гэта ня грошы! У год мы прапіваем ўсім сялом каля 9 тысяч руб. Чаму-б не пусьціць хоць бы палавіну іх на добрую справу? І пьянства-б было меней, менш бы было калатні і ўсякаго непатрэбства, і дзеткі-б нашы пазналі разумнейшае жыцьцё.

*К. М.*

---

## З народнай мудрасьці.

Не дармо называюць людзі прыказкі народнай мудрасьцю: у іх папраўдзі змешчаецца тое, што народ выразумеўшы замацаваў у колькі славах. Само сабой, што гэткіе кароткіе мысьлі выказаные аб розных зьявах і варунках цікавы, але бадай найцікавейшые будуць прыказкі выказываючые характар розных суседніх народаў, ці племенных груп паміж сябе.

Наш беларускі народ німаючы сваей пісанай літэратуры, тварыў, і заховываў старую, вустную літэратуру чым і аб'ясняецца тое багацьце розных песень, казак і прыказак у нас. Не глядзя на тое, што песьні, казкі і прыказкі беларускіе запісывало тысячы людзей, задрукавана імі сотні томоў кніг, але ешчэ далёка ня ўсё цікавае сабрана.

Тут я хачу даць чытачам колькі сабраных мной прыказак беларускіх характэрызуючых людзей у паасобных беларускіх правінціях. Справядліва гэта характэрыстыка ці не, не бяруся ручацца, даю тое, што сабраў.

*Брэтчукі* і да выпіткі і да выбіткі складны.

*Бельшчукі* у тры сякеры сякуць, аднаго рака пякуць.

---

то й глядзі, маланьня. Збіраліся буры. Ябланкі гальлём: „Шу-шу-шу“...—ціхенька шумелі.

Архіп спаў.

---

5.

Лес гулка гаманіў. Макухі дрэў трывожна, неспакойна так нахіляліcь то дужа хутка, то паважна адна к другой шэпталі нешта, сваё—лесавое. Дарожка паміж густых елак ўсё вузела і вузела, а ні прайсці, а ні пралезці, а ні прадрацца праз калючые зялёные іголкі.

Сухое дрэва страшна і балюча скрыпало, бытцым варажыло бяду і горэ і усякае ліха. А ешчэ далёка, далёка...

— Баў,—гудзіць звон на колькі верст уперадзі, гукае к сабе, завець, клічэ. А як жэ дайсці туды?

— Баў, баў, баў, дзілінь-дзілінь, баў,—дробна атдаецца у вушах, шуміць лес, зарагатаў злый дух, заплакаў жаласна, закугакаў і зліўся ў аднэй жудасна-сумнай песьні скрыпучаго дрэва.

Блішчыць аганёк пад кустом, во-во другі пад старою бярозаю, а во трэцьці каля чорнаго пня, во й ешчэ адзін, ешчэ, многа, многа, зданьнё...

„Што гэта я?—думае сабе Архіп,—то-ж чэрвякі купальскіе свецяцца, чаго-ж баяцца мне? Пайду на звон шпарчэй, нанач дабяруся, дацягнуся“.

— Троп, троп, хр—гкрдзбдзр,—кажан кала самюсенькаго вуха шпоркнуў.

— Цзынь, цзынь, — без канца плачэ аб нечым камарок здохленькі і не дае спакою.

Зайшлося сэрцэ у Архіпа, схапіў ці не схапіў кажан волас з галавы у яго? Занясець ён той валасок на скрыпучае сухое дрэва, зашчэміць яго там паміж скабак калючых... І будзе сохнуць, як дрэва тое, Архіп; датуль будзе хварэць-прападаць, пакуль дрэва скрыпець будзе; заваліцца, бахне аб землю яно — і Архіп памрэць.

Разступіўся лес. На палянцы стаіць Архіп. Бачыць,—што гэта?—Хата іх новая перад ім на аднэй назе круціцца, скачэ, верціцца...

„А—а, гэта я сон бачу, гэта я сьню ўсё...—уцяміў Архіп, — але-ж які дрэнны сон, непадобны. Нячысцікі, мусіць, кіруюцца спужаць мяне, студэнта-мэдыка,—сьмешна стала яму дужа. — А хараша спаць, німа зданьнёў“.

„Скрыпела дрэва нейкае?“—прыпамінаў Архіп, — „ай не, то-ж бацька па печы храпіць сабе“.

„Засну крапчэй“, — падумаў студэнт. „А гдзе-ж музыка чуваць такая жалобна-пекная?“.

„Ай, а-я-яй“...—ташнуе Архіп; жалю, болю, суму тугі непазбытнай у тых гуках дзевацьне куды, а музыка ўсё бліжэй ды бліжэй.

Грае-грае ліра старэцкая аб часох мінуўшчыны, старадаўшчыны. Спевае сьляпы старэц-музыкант, перэбірае не хапаючыся па струнах тых, гучна-маркотных...

А ня струны гудзяць пяюць тое, а чэлавецкіе галасы чутны там. Далёка, у гору, думна так у паднябесься паднімаецца голас сярэдні, ні таўсты і ня тонкі, ня цененькі, аб нейкай долі-нядолі сьпеваець ён, плачэ, плачэ, галосе, у ніз спускаецца, клоніца, ў адзін енк-плач зліваецца з другім, таўсцейшым, нездаволенным голасам, што ня хочэ бачыць, як крыўда-непраўда па свеці пануе царствуе, рагочэ ён, гудзе, ую-юу-у... А трэцьці, чутна, кволенькі голас, як дзіцятка малое заходзіцца-залівaецца, да Бога і Маткі Прачыстае шле у тонах цудоўных мольбы-прозьбы дзіцячые-простые-чыстые...

Штосці паднімаецца на сэрцы у Архіпа ад музыкі гэтае: плакаць, стагнаць, слёзы ліць жадаецца, думкі любые выплакаць-выгукаць бажаецца, і млосна-мляўна так робіцца, шчэміць у грудзёх маладых, жалка, жалка, усе людзі добрые, ладные, пекные, а як мучаюцца бедные...

У спрэчкі с чорным-страшным-безпраўным ідуць музыкі-скамарохі у граньні сваём, — і кіпіць-бьецца сэрцэ хлапецкае... Эх! Пайсці і моц сваю на ўвесь сьвет паказаць, прагнаць крыўдзіцялёў, вытурыць іх ад людзей бедных, шчырых, змірных і пакорліва-прыяючых, людзей родных і балюча-скрыўджэных.

І добра на зямельцы будзе ўсім, усе родные, радые, усе дужые пекные і ладные. Свеце сонейко, а ў гайку птушачкі спеваюць вясёла ладненька, кветкі-красачкі цьвітуць, пахі-араматы прыёмные-любые носяцца, шуміць жытцо вісокае, доўгакалосае, шэпчэ думу сьвятую, ціхую каласамі буйнымі, падзяку пяе працы мужыцкай, а не мужыцкай, — селянскай працы, справядлівай...

А у хаці відней ды відней, але скуль жэ свет гэты цудоўны? І музыка дужэй усё чуецца, шырыцца яна і бліжыцца.

Чуваць ўжо і сьпевы хаўтурные, цяжка—ціха-плакучые. Вые хтось, заходзіцца, дзявоцкі плач то, няўцешна, пэўне што

*Барысавец* дурны як варона, а хіцер як чорт.

*Гродзенчукі* хоць і пабожные, але ні Богу ні чорту ня ўступяць.

З *Лідчуком* і на зайца ня йдзі, бо ўцячэць.

*Мінчукі* задзіры с чужымі, сварлівы с сваімі.

*Мозырчукі* адвакатамі родзяцца.

*Навагрудчане* крэпкі галавой ды слабога сэрца.

*Ашмянчукі* с цеснай калітай, а с шырокім горлам.

*Аршане* ні чытаць, ні пісаць, а толькі з гаршкоў хапаць.

*Палачане* калі што радзудзяць, то і чорт ня згудзіць.

*Пінчукі* і Бога хваляць і чорта кволяць (лашчуць).

*Рожанчукі* сярдзіты ды ня дужы.

*Случчакі* у чужой цэркві любяць сьвечкі папраўляць.

*Слонімчукі* у голад намруцца, у вайну налгуцца.

*Віленчукі* лыкам людзей меруць.

*Воўкавысчане* больш славу чым жыцьцё берагуць.

*Вітэбшчане* з завіднымі вачамі салодкіе словы сыплюць.

*Смаленчукі* увайшоўшы у драку хахла не шкадуюць.

Ю—ы.

---

## Песьня жніва.

Жарыць сонцэ без літосьці,
Варам пышэ ад палёў;
Трэцца жыта ў пух на просьці,
Зерне сыплецца далоў...
Хоць бы хмарка дзе у небі,
Хоць бы рэдзенькі цянёк,
І без часу ў цьвёрдай глебі
Сьпее грэчка і лянок.
Душна ў полі і маркотна
Постаць жоўтая хлябоў
Ціхім шэлестам гаротна
Просіць жнеек і сярпоў.
Вот прышлі яны на поле,
Заскакаў крывы сярпок,
І панёсся на прывольле
Сумны жнейчын галасок,
Голас мілы і пявучы,
Як вясенька, малэды,
Нескончоны і цягучы,
Поўны тугі і нуды.
І панёсся ён мяжою,
Ціхім жалем загучаў,
Потым дробнаю слязою
У неба вырваўся, прапаў...
Колькі смутку ў песьні жніва!
Хто той смутак парадзіў?
Ці ты, жыцьцё нешчасліво?
Ці ты, журба нашых ніў?
Ці то вы, палé няплодны,
Горэм песьні спавілі,
Каб заўсёды край свой родны
З плачам ўспомніць мы маглі?

Якуб Колас.

---

## Дзед.

Ад хаты да хаты
Дзядулька дыбае.
Адзежа ўся ў латах
На ём павевае.
У лазовые ланці
Абутые ногі,
У руках кій хваёвы—
Таварыш дарогі.
Вісяць цераз плечы
Амаль не да пятаў
Дзьве торбы ля хлеба
Са зрэбных ўсе латаў.
Увойдзе да хаты
У парогі ён стане
Аддасьць пахвалёны
І пацяр зацяне
Як пацеры скончыць
Да Бога ўзывае,
Хай гэтую хату
Ад бед захавае.
Ручыць хай жывёлу
Ад ліха, упадку
Ад ўсякіх здарэньняў
Ад ўсякіх прыпадкаў.
Каб Бог міласьцівы
Грахоў даў прашчэньне,
Каб ўро'джай быў у полі,
Ды добра насеньня.
І йшчэ чаго многа
Дзядулька накажэ,
Чаго і не ўздумаць,
Й язык не раскажэ.
И за гэта дзядулька,
За ўсе пажаданьня.
Чы лустачку хлеба,
Чы сала дастане
І дзякуе доўга,
Да Бога ўсклікае.
Аддасьць пахвалёны
І далей дыбае.
І так ў кожнай хаці,
Усе тое гаворыць
Усё тымі славамі
Ен Бога ўсе моліць.
А пройдзе ўсю вёску
Дзілень заначуе.
А ўстаўшы назаўтра,
Так далей мандруе.

*М. Арол.*

* *
*

Хоць мне жыці трудна,
Хоць ні маю долі,
Ды ня рвусь я к людзям
Шукаць ветру ў полі...

Бо на што шукаці,—
Свой гудзіць заўсёды
І суліць мне ў прышлым
Долю і свабоду.

А. Петрашкевіч.

1913 г.

---

# Аб усім па троху.

### Татка тысячы дзятак.

У Амэрыцы знайшоўся такі ахвотнік да дзяцей, што ўжо прыняў за сваіх 300 дзетак, а ешчэ абецаўся прыняць іх 700. Разумеецца, каб узгадаваць гэткую сямейку, трэба не малога кошту, але амэрыканцу не страх: мае ён шмат мільёноў грошы дык пабудаваў асобные для сваіх дзяцей дамы, школы, дае ўселякіе выгоды, і кожнае дзіця сваё хочэ вывясьці ў людзі: каб пакончалі навукі, унівэрсытэты і т. п., а пасьля яго сьмерці—ўсе мільёны будуць падзелены пароўну паміж гэтай грамадкі.

На тое Амэрыка: нашых бацькоў хоць усіх разам злажы, і то ня выйдзе і аднаго такога «таткі». А як бы нам прыгадзілося мець які дзесятак такіх бацькоў...

### Паэты і алькогаль.

Шмат паміж вялікіх паэтаў і пісьменьнікоў з усяго сьвету праз лад ужывалі спірытусных напіткаў. Праз нейкі час было нават прекананьне, што гэта ім памагало да самога пісаньня і што найважнейшые думкі радзіліся толькі у пьяной галаве. Тымчасам, як цяпер паказываецца ўсё гэта няпраўда. З запіскаў такіх вялікіх паэтаў і пісьменьнікаў, як Эдгар По, Тэафіль Готэ і другіх, каторые шмат ужывалі алькогалю, відаць, што па п'янаму ніколі нічога добраго папісаць яны не маглі, а калі і пачалі якую працу, то ніводнай з іх ня скончылі, бо увесь арганізм п'янаго чэлавека вельмі скора слабее.

---

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

### Сёлетні ураджай.

Сёлета на Беларусі ураджай нагул ня кепскі нават, лепшы як у прошлым гаду, толькі што пагода ня шэнціць і ні дае сабраць яго добра. Асабліва маюць быць добрые аўсы і у пару сеяные ячмяні каторые ужо пасьпеваюць.

### Конфіскацiя.

Віленскі камітэт спраў друку сканфіскаваў № 29 літоўскай газэты „Lietuvos Ukininkos“ за стацьцю аб 4-й Гасуд. Думе.

### Гімназія у Лідзе.

У Лідзе гэтай восені аткрываецца гімназія для хлопцаў. Уступные экзаміны пачнуцца ад 20 Жніўня. Прозьбы аб прыняцьці ад 1 жніўня прыймаюцца у канцэляры гімназіі.

### Пажары.

У Шчучыне (Лідзк. пав.) у маетнасьці кн. М. Друцкай-Любэцкай згарэла фабрыка фарніру, страты лічыцца на 60,000 рублёў.

### Пілнуйцеся свайго.

Нашае Даўгінава дужа гандлёвае і ажыўленнае мястэчка. Шмат селян с суседніх вёсак прыежджае у нядзелі, а ешчэ болей на торг у чэцьвяргі. Але дармо шукало-б вока нацыянальнай беларускай адзежы. Праўда, сермягі і кажухі носюць ешчэ блізка што ўсе, але самадзельная адзежа усё болей і болей выцесняецца фабрычнай тандэтай. Ешчэ меней свайго асталося у жаночай адзежы. Тут ужо саўсім усё крамнае, беларускіх галаўных убороў, шнуровачак, у нашым мястэчку ніколі не ўбачыш. Эх, браткі! Нашто-ж гэта вы усяго свайго чураецеся? Няўжо-ж у вас ужо саўсім загінуло пачуцьцё красы і вы не бачыця на сколькі прыгажэй свая, добра зробленая, адзежа ад тандэты якую вы цягаеця. Строіцца-ж вясковая моладзь, як хлопцы, а ешчэ болей дзеўчаты, дужа любяць. Чаму-ж вы ня строіцеся у сваю родную, нацыянальную адзежу, каторая і пекна і танна, а гэтулькі выкідаеця грошы на тое, каб адзецца па „панску“. „Старые“ дужа нарэкаюць на тое, што гэтые строі саўсім руйнуюць народ. І праўду яны кажуць. Цяпер моладзь апошнюю капейку атдае на тое, каб мець камашы, галёшы, панскі гарнітур, каўнерыкі. Дзеўчаты ешчэ болей строяцца, некаторые да таго дайшлі, што нават малюць сабе сажай (ці іншай якой брыдой) бровы і чырвонай паперай, ці бураком, колеры на твары.

І сьмешна і сумна глядзець на гэта. Другі з апошніх сіл выбіваецца, не даедае, ня купіць дужа патрэбнай у гаспадарцы снасці, а глядзюць каб быць адзетым не пушчэй другіх.

Нашто гэта? Усе мы дужа бедные, цяжка працуем, каб зарабіць грошы і ўсё роўна ніколі іх не хапае, ўсё роўна бядуем. Нашто-ж ешчэ гэтак руйнавацца на адзежу. Ціж ня лепей за тые грошы, што мы дарма пушчаем — гуртам, у складчыну выпісываць кнігі, газэты, журналы. Шмат чаго з іх даведаемся, як людзі жылі і жывуць на сьвеці, як яны палепшаюць сваё жыцьцё, што нам для гэтаго трэба рабіць, як лепей гаспадараваць, каб большы быў даход і іншае і іншае. Калі мы згаворымся гэта

---

Зірнуў Архіп на хату, бачыць—падлога каля печы разступаецца, выходзе, паднімаецца труна аграмадная с пакрывамі чорнымі. То паднімецца, то схаваецца; то цаднімецца, то схаваецца...

Валасы дыбком у Архіпа становяцца, хочэ ён падняць галаву, пабачыць лепей труну страшную,—цяжкэ галава, не паднімаецца; хацеў рукою крыж па сябе палажыць,—рука, быццым палка, не шавеліцца; крычаць-гукаць. ратуйце зваць памкнуўся ён,—а ні каліва голасу німа, як і не было яго ніразу, толька воздух цяжкі у рот набіраецца, паветрэ смярдзючае увакруг ўсюдых.

Добра сьпіць Архіп, дзіўна спіць Архіп.

А на дварэ маланьня блíснула вялікая, жудасная, загрымеў гром, па ўсяму небу вялікі грукат-грымот пайшоў, у самые далёкіе канцы глуха і дробна пакаціўся, пасыпаўся і раптам: „трах-тара-рах-рах“... трэснуў, стукануў пярун.

Ірвануўся Архіп з усіх сіл сваіх, з усіх жыл сваіх і праз страшны сон з лаўкі на зямлю паляцеў, балюча аб падлогу урэзаўся...

Прачнуўся Архіп: смольлю пахне, гарыць нешта, бацька с печы саскочыў, крык падняў.

— Сыночак, Архіп, бяры падушку, пярун, знаць, ударыў, гарым...

Аглохшый падняўся студэнт ат гулу бальшога. Добра йшчэ — не ў хату, а ў сенцы полымя адразу свіснуло. Высадзіў Архіп бацьку у вакно і сам скочыў, а полымя ужо у вокны з сянец так і лезе-ірвецца, адразу усе вуглы абхапіло, во ўжо і ў хату кінулося...

— Баў, баў, баў...—зазваніў вартаўнік у званіцы.

— Тата, татуля, табе не пашкодзіло?—Архіп у бацькі запытаўся.

— Не, дзякуй Богу, а ніскалічкі. Толькі звон у вушах, аглушыла троху. Ну ці трэба-ж-ткі гэта! А Божухна, а во-хці, а вой-я...

— Татка, куды-ж ты?

— А? гэта я дзівуюся, як шугае, пойдзем, ідзі, а то матка убачыць, спужаецца, ці жывы хоць мы пазасталіся?

— Пажар! Пажар! Ратуйце! — крычэў ўжо нехта па сяле, заварушыліся людзі, збегаюцца.

— Гдзе, хто гарыць?

— Новая хата у Лінкевічаў.

— Ці там?

— Няго-ж—не, вун, ай-ай...

— Падзівуйся, во шугае, і помачы не дасі.

— Якая тут помач: пярун чорта забіў.

— А маўчы-ж ты, ай сказіўся?

— Добра, што воддаль двароў пабудавалі, на сяло не перакінецца.

— А не, ніхай Бог крые.

Немалые клубкі дыму чорна — чырвонаго выбіваліся праз стрэху новую саламяную, чырвоные язычкі полымя са хцівасьцьцю і прагавітасьцю рупліва лізалі бярвеньня кідаліcь у бок і наводзілі сваёй маўклівай і незразумелай руплівасьцьцю—рухомасьцю думку аб вечным і безатказным, адкуля ўсе і што яно?

Сьцены трэскаталі і абваліласа патроху, бура прайшла, дзікі віхор зьмяніўся ціхенькім, прыязным ветрыкам, зашамацеў па лісьцьцю дожджык, далёка, за панскім лесам бліскала заціхаючая маланья.

— Ну скажы ты!... Бог ведае, к чаму і што? І гэта здарэньня: пярун ударыў, людзі жывы асталіся, а хата згарэла. Мабыць і стары Лінкевіч ня будзе надта клапаціцца па хаці; згары лепей яна, чымся цярпець у ёй гэткае страхацьцё. Злыдні у ёй нейкіе былі—ткі.

— Ай не гавары ты, кум; можэ тое праўда, а можэ батрак набрэхаў, што яго с печы скінуў нехта. Хвароба яго ведае.

— А сам Нупрэй Лінкевіч? Ен жэ сам казаў, што засьне на зэдліку, а прашнецца пад зэдлікам.

— А мала што бывае? Зэдлік вузкі, вот і зваліўся стары.

— Ну, браце, тут ні так...

— Што, ці я-ж не казаў? Як вільчылі гэту хату, дык ішоў нейкі старэц. Ну ладна, майстрам давалі гарэлку; трэба, калі па гаспадарску, і старцу-б даць, пачаставаць. Ні далі, пэўне і падчараваў. У яго вочы такіе чырвоные, чараўніцкіе, кроўю паналіваліся. Я так і падумаў што ён ведзьмак, што не падаруе.

— А дось табе, дзед, лухту пароць... Падчараваў, падчараваў. Ешчэ што выдумай.

— Думай як сабе хочэш, а я добра ведаю што яно так.

— Дык жэ вот, гадоў дваццаць назад, як асінавым калом прабівалі, ня тут будзь казана, што выхадзіў з магілы кроў ссаць, нябошчыка.

— Не гавары... Ноч цяпер, граза, гай не далёчка, дось... ня гожэ, не варта

— Пойдзем, браткі, спаць.

Максім Беларус.

(*Канец будзе у чародным нумэры*).

